Аўтар: Вольга Бубіч, 21/07/2015 | АРТ Культ Актыў праект

# «АНАТОМІЯ. ІДЭАЛЬНАЕ ЦЕЛА»: АДКАЗЫ НА ШЛЯХУ ПОШУКУ

Гэтае лета нечакана выявілася надзвычай багатым на цікавыя праекты, рэалізаваныя як на прыватных, так і на дзяржаўных пляцоўках сталіцы. Усяго пару дзён таму ў галерэі «Ў» адкрылася групавая выстава «Вымярэнне пустаты», радуе адважным супрацоўніцтвам з актуальным мастацтвам Літаратурны музей Максіма Багдановіча, на прасторы якога здзейснена мастацкая інтэрвенцыя «Усё, што цвёрдае, растае ў паветры» (абедзве выставы ладзяцца ў межах праекта «АРТ-СОЦ-ЛАБ»). А Цэнтр сучасных мастацтваў ужо не першы год аддае свае залы пад **праект «Анатомія»** куратару і мастачцы **Дзіне Даніловіч**.



Фрагмент серыі Таццяны Лісоўскай «Dolce e vita» / выстава «Anatomia. Ідэальнае цела», Менск 2015

Праблемы цялеснасці — далёка не новы кірунак у куратарскай дзейнасці Дзіны Даніловіч. Першая групавая выстава «Анатомія» была паказаная на арт-пляцоўках Віцебска ў сакавіку 2013 года, аб'яднаўшы пад адным дахам працы 18 аўтараў. Сёння, праз тры гады, удзельнікаў больш, а менскіх залаў, дзе дэманструюць фота, відэа і інсталяцыі, — 11. І калі падчас першай выставы Дзіна скардзілася на складанасці ў пошуку ахвочых выставіць свае працы, то цяпер, назіраючы разнастайнасць прадстаўленых праектаў, сумненняў у недахопе імёнаў не ўзнікае.

> ***Аднак «Анатомія» відавочна вырасла не толькі ў колькасным, але і ў якасным плане. А больш за ўсе радуе з'яўленне аўтараў, якія нарэшце пачалі разумець, што зададзеная тэма мяркуе далёка не толькі фатаграфаванне голых жанчын альбо «хлопчыкаў, у якіх усё бачна».***

У гэтым сэнсе, сыходзячы з размежавання, прапанаванага выбітным французскім даследчыкам **Андрэ Руе**, фотапраекты «Анатоміі-3» можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Тыя, дзе фатаграфія ўсё яшчэ выступае ў якасці састарэлай сёння «фатаграфіі-дакумента», і тыя, дзе яна прадстаўляе іншыя, «абыходныя» шляхі доступу да рэчаў, фактаў і падзеяў: пераходзячы ад *«калькі [рэальнасці] да мапы, ад ідэалу праўды і блізкасці да бясконцай гульні аддалення і дыстанцый»* [1]. У першую групу, на жаль, трапляе пакуль большая колькасць прац — такіх, дзе гледачу прапануецца разам з аўтарамі фота атрымаць асалоду ад літаральнага чытання паняцця «ідэальнасці», гэта значыць разглядаць здымкі ідэальных агаленых целаў. У пераважнай большасці, натуральна, жаночых і юных. І калі прысутнасць у экспазіцыі натуралістычных прац класіка польскай фатаграфіі **Збігнева Длубака**, выкананых у 1970-1974 гады, можна растлумачыць жаданнем куратаркі найбольш поўна, у эвалюцыі, прадставіць заяўленую тэму, то прычыны звароту да сінанімічнай і сёння абсалютна не актуальнай візуальнай мове ў работах сучаснага маладога аўтара **Андрэя Карачуна** незразумелыя. «Асэнсаванне цела», заяўленага ў назве праекта, так і не адбылося.



Фрагмент серыі Андрэя Карачуна «Некаторыя практыкі асэнсавання цела» / выстава «Anatomia. Ідэальнае цела», Менск 2015

Такім чынам, больш падрабязна хацелася б спыніцца на праектах, якія трапляюць пад тэг «фатаграфіі-выразы», куды з упэўненасцю можна аднесці серыі Таццяны Лісоўскай, Сяргея Ждановіча, Алены Пратасевіч і Сяргея Кажамякіна.

У праекце дызайнеркі ды фатографа з Віцебска **Таццяны Лісоўскай «Dolce e vita»** і ў трох працах **Сяргея Ждановіча з серыі**

**«Метаморфінг»** выкарыстоўваюцца неадушаўлёныя прадметы (цацкі), праз іх адбываецца крытыка канцэпцыі «ідэальнага цела». Праекты аб'ядноўвае пільная цікавасць да лініі пластыкавых лялек Барбі, якая, як адзначала ў сваім фундаментальным даследаванні «Полая жанчына: свет Барбі знутры і звонку» пісьменніца Ленор Гаралік, уяўляе з сябе *«клубок цалкам не цацачных тэм: грамадства спажывання, гендарнае самавызначэнне, глабалізм, этнічная і расавая варожасць, сучасная педагогіка, няпоўныя сем'і, успрыманне поп-культуры, сацыялізацыя асобы, страх смерці — словам, усё, што на сённяшні дзень утварае кола найбольш актуальных і найбольш балючых праблем чалавечага грамадства»*[2]. Беларускія аўтары, натуральна, не з'яўляюцца наватарамі ў разгортванні канцэптуальных гульняў у лялькі. Барбі ў сучаснай фатаграфіі — надзвычай папулярны персанаж, які натхняе мастакоў на часам вельмі вар'яцкія ідэі. Дастаткова ўспомніць жорсткі праект Марыэль Клейтан (Mariel Clayt), што паказвае садысцкія схільнасці амерыканскай іконы прыгажосці, серыю партрэтаў-калажаў Шэйлы Пры Брайт (Sheila Pree Bright) альбо іранічныя тэатралізаваныя мізансцэны з касцюмаванымі героямі — «Паўшыя прынцэсы» і «У лялечным доміку» Дзіны Голдштэйн (Dina Goldstein).

Гульні, у якія гуляюць са сваімі лялькамі Таццяна Лісоўская і Сяргей Ждановіч, пры адсутнасці тлумачальнага куратарскага ці аўтарскага тэксту паўстаюць не настолькі чытэльнымі і выразнымі, чым тыя, што мы бачым у праектах іх замежных калегаў. Аднак эмоцыі і разважанні, якія яны выклікаюць, моцныя і шматслойныя. Так, віцебская фатограф стварае ў сваіх фотаздымках аптычныя ілюзіі, звязаныя з перспектывай і маштабам лялек, тым самым прапаноўваючы падумаць над неадпаведнасцю патрабаванняў грамадства і масавай культуры да канонаў прыгажосці і «ідэальнасці» чалавечага цела ў сучасным свеце.

> ***На бессэнсоўнасць гэтых патрабаванняў таксама ўскосна намякае часта прысутная на здымках маска — у чым, як не ў сляпым пераймання штучных ідэалаў, можна вінаваціць натоўпы прыхільнікаў гламурнага свету?***

Працы **Сяргея Ждановіча**, з прычыны вялікага маштабу і прастасці франтальнай кампазіцыі, выглядаюць лаканічнымі і таму пужаюць. Антрапаморфнасць, заканамерна закладзеная ў вобраз любой цацкі, у праекце гэтага аўтара ўзводзіцца ў абсалют. Безабароннае, нерухомае, застылае ў ненатуральнай паставе безгаловае («ідэальнае») цела лялькі, бязвокая пластыкавая цацка Пятачок, дыснэеўскія прынцэсы ў манерных позах, з-пад спадніцаў якіх замест ног выглядаюць пачварныя «пратэзы» — што стаіць за прыгожымі выявамі ідэальнага? Гледзячы на трыпціх з «Метаморфінгу», адказ на гэтае пытанне глядач адчувае на ўзроўні несвядомых перажыванняў: страх, асуджанасць, адчуванне тупіковасці прытрымлівання ненатуральных прынцыпаў «Барбі-свету».

Яшчэ адным годным праектам «Анатоміі-3» ёсць візуальнае даследаванне матэрыялаў малюнкаў рэсурсу «Ebay», якое правяла фатограф **Алена Пратасевіч**. На працягу шасці месяцаў яна праглядала раздзел з фатаграфіямі, пазначанымі #Perfect Body, збіраючы свой уласны лічбавы архіў знаходак з усяго свету. Вынікам стала фотатэка, што налічвае больш за 200 малюнкаў, некаторыя з іх і ўвайшлі ў экспазіцыю «Анатоміі-3».




Фрагмент серыі Алены Пратасевіч «#Perfect Body (хэштэг Ідэальнае цела)» / выстава «Anatomia. Ідэальнае цела», Менск 2015

Сама аўтарка так апісвае мэту сваёй канцэптуальнай калекцыі: «*Складанне гэтага архіва мела для мяне выключна даследніцкі інтарэс, пры гэтым я не ставіла за мэту атрымаць у выніку тыпалогію, візуальную дыяграму альбо класіфікацыю — мне было важней зразумець, чаму людзі адносяць той ці іншы фотаздымак да катэгорыі „ідэальнае цела", убачыць прыкметы, па якіх яны называюць прадстаўленае цела ідэальным*». Высновы, якія можа зрабіць, разглядаючы сабраныя Аленай Пратасевіч здымкі, выдатна кладуцца на канцэпцыю сучаснага разумення прыгажосці як «выпрабавання», прадстаўленую ў працы «Мастацтва прывабнасці. Гісторыя цялеснай прыгажосці ад Рэнесансу да нашых дзён» прафесара Універсітэта Парыж V **Жоржа Вігарэла**. Спецыяліст у галіне рэпрэзэнтацыі і культурнай гісторыі цела лічыць, што для цяперашняга этапу развіцця культуры і соцыуму характэрная высокая значнасць індывідуальнасці, якая стала асновай сучаснага свету.

*«Асоба „вызначаецца сваім вонкавым выглядам", як сцвярджае сацыёлаг Ален Эрэнберг, прычым выключна знешнім выглядам: тое, што чалавек дэманструе на „цялесным" узроўні, становіцца гэтак жа важна, як тое, што ён кажа. Адсюль празмерная стараннасць у імкненні „паказаць" сябе, бачную частку свайго „я", сваю працу над прыгажосцю, каб прадэманстраваць цэласнасць сябе як асобы»*. [3] Разважаючы пра «працу над прыгажосцю», Жорж Вігарэла мае на ўвазе шэраг «выпрабаванняў», якім сённяшні чалавек гатовы сябе падвяргаць з мэтаю дасягнення ідэалаў, што актыўна транслююцца праз тэлебачанне і музыку. Гэта разнастайныя модныя дыеты, павальнае захапленне фітнесам і танцамі, рост папулярнасці трэнажорных залаў.

> ***Месца асноўных крытэрыяў прыгажосці цела трывала занялі эратычныя і функцыянальныя абліччы. І ілюстрацыі менавіта гэтых рысаў мы бачым у адабраным Аленай Пратасевіч матэрыяле з сусветнай сеткі.***





Фрагмент серыі Алены Пратасевіч «#Perfect цела (хэштэг Ідэальнае цела)» /
выстава «Anatomia. Ідэальнае цела», Менск 2015

У якасці выказванняў пра ідэальнае цела, дзе выразна прагаворваюцца канцэптуальныя аспекты дадзенай праблемы, неабходна адзначыць два найцікавейшыяпраекты класікаў беларускай фатаграфіі — **Сяргея Кажамякіна («У пошуках ideal body»)** ды **Ігара Саўчанкі («Дапушчэнне Кшыжаноўскага»)**. Першы спалучае ў сабе візуальны матэрыял і элементы інсталяцыі — выпуклыя літары шрыфту Брайля, замяніўшы якімі звыклае «бачанне ідэальнасці», аўтар прапануе гледачу самастойна адказаць на пытанні: *«Ці любая бачнасць выклікае давер… Ці можам мы растлумачыць, стоячы перад карцінамі, скульптурамі і фатаграфіямі, якія дэманструюць прыкрашаныя, ідэалізаваныя, а часам і знявечаныя целы, чаму мы так упарта іх выяўляем?»* Прымаючы прапанаваныя фатографам правілы гульні, мы здольныя паспрабаваць пераасэнсаваць папулярныя ўяўленні пра прыгажосць і ідэальнасць (выпадкова ці не, але ў той жа зале, якраз за нашай спінай, знаходзяцца серыі Андрэя Карачуна і Алены Пратасевіч), задзейнічаючы ў іх пазнанні тактыльныя адчуванні.

> *Што ж у такім выпадку застаецца ад «ідэальнасці»?*

Пасля эксперыментаў адкрытага дыялогу Сяргея Кажамякіна з гледачом у экспазіцыі ўзнікаюць «тэксты» Ігара Саўчанкі. **«Дапушчэнне Кшыжаноўскага»** задзейнічае выключна тэкставы медыум падачы інфармацыі, а саму ідэю праекта можна апісаць як увогуле кульмінацыю ўсёй «Анатоміі-3». Застаючыся верным свайму «тэкставага стылю» актуальнага перыяду творчых пошукаў, фатограф і літаратар Ігар Саўчанка прапануе дэталёва перапрацаваны ланцужок разважанняў пра ідэальнае цела, крытэрыі вызначэння якога ён супастаўляе з працэсам факусоўкі люстранога і дальнамернага фотаапаратаў. У фінальным пасажы разваг аўтара мы чытаем:

*«З'яўляемся мы толькі спосабам фармавання гэтага канала альбо / і самой крыніцай сігналу, і што там — на прыёмным баку? Як ведаць, што адкрыецца нам у адказах на гэтыя пытанні ці нават на шляхах пошуку такіх адказаў?»*



Праца Ігара Саўчанкі «Дапушчэнне Кшыжаноўскага» / выстава «Anatomia. Ідэальнае цела», Менск 2015

Суаднясенне гэтай высновы з цэнтральным паняццем экспазіцыі — ідэальным целам — дэмакратычна, зусім на іншым узроўні абагульнення зводзіць «шляхі» персанальных шуканняў усіх 22-х аўтараў пад адзін добры, аптымістычны назоўнік, які прадугледжвае нязменнае суб'ектыўнае адкрыццё: калі не на выхадзе, дык абавязкова ў дарозе. І, нібы па іроніі лёсу, на выхадзе з залы са мной пачынае гутарку пажылы наглядчык Цэнтра. *«Ну, што ж вы хочаце? — з доляй мудрай паблажлівасці пытаецца ён. — І ў Шышкіна, і ў Левітана былі свае канцэпцыі. Усё ж не проста так „малявалі“. Ва ўсіх свая філасофія».*

*«І насамрэч — усё ж так і ёсць!»* — думаю я. Хтосьці, рэфлексуючы ў сілу сваіх магчымасцяў на тэму «ідэальнага цела», здымае дарослых жанчын на фоне гламурных партрэтаў іх «ідэалаў», побач з якімі гэтыя жанчыны не могуць не прайграць, выглядаюць стомлена і страчана. Хтосьці здымае ў розных ракурсах хударлявага аголенага мужчыну, сарамліва прыкрываючы яго палавы орган панарамнай фатаграфіяй горада. Хтосьці бегае па лесе з голай дзяўчынай і фотаапаратам… Усе яны шчыра шукаюць і знаходзяць свае адказы.

Усё ж не проста «малююць».



Фрагмент серыі Дзіны Даніловіч «Блізкасць» / выстава «Anatomia. Ідэальнае цела», Менск 2015

**Вольга Бубіч**

[1] Андре Руйе «Фотография. Между документом и современным искусством»
[2] Ленор Горалик «Полая женщина: мир Барби изнутри и снаружи»

[3] Жорж Вигарелло «Искусство привлекательности. История телесной красоты от Ренессанса до наших дней»

*Фатаграфіі В.Бубіч*

*Меркаванні аўтараў не заўсёды супадаюць з пазіцыяй рэдакцыі. Калі вы заўважылі памылкі, калі ласка, пішыце нам.*

Тэгі: беларуская фатаграфія, выстава

Like +1 Упадабаць Твітнуць

## Leave a Reply

Name (required)

Mail (will not be published) (required)

Website

Submit Comment

## ЧЫТАЦЬ ЗЬ ІНШЫХ РУБРЫК



галоўнае дыскурс

### ПРАМОВА ІНГА ШУЛЬЦЭ



галоўнае дыскусія літаратура

### ПЕРАКЛАД: СТРАХІ, АБМЕЖАВАННІ І ЛЮБОЎ



галоўнае дыскурс

### SILENT HUNTING



Дзе набыць?

Крама «Ў», кнігарня «ЛогвінаЎ» (Менск, пр. Незалежнасці, 37а), крама «Падземка» (Менск, пр. Незалежнасці, 43). Па пытаннях продажу ў іншых гарадах Беларусі пішыце на адрас: partisanmag.by@gmail.com

Пошук

pARTisan©, 2012-2023. Дызайн: Vera Reshto. Web development by Kasten Technology